*УДК 392.51(476.2-37Гомель)*

**В. С. Аніскавец**

***Навук. кір. – В. С. Новак, д-р філал. навук, прафесар***

# ВЯСЕЛЬНАЯ АБРАДНАСЦЬ ВЁСКІ ЧКАЛАВА ГОМЕЛЬСКАГА РАЁНА: МЯСЦОВАЯ СПЕЦЫФІКА

*Артыкул прысвечаны характарыстыцы традыцый вясельнай абраднасці асобнай вѐскі (в. Чкалава) Гомельскага раѐна Гомельскай вобласці. Аўтар на багатым фактычным матэрыяле, апублікаваным у фальклорных зборніках, выяўляе адметныя лакальныя рысы мясцовага вясельнага абраду, засяроджвае ўвагу на абрадавых этапах і звязаных з імі народных вераваннях.*

Вяселле – той від сямейна-абрадавага фальклору, звесткі пра якi можна запiсаць i сѐння. Звернемся да аналізу матэрылаў па вясельнай абраднасцi вѐскi Чкалава Гомельскага раѐна.

Вядома, што структура вясельнага абрадавага комплексу ўключае давясельны, уласна вясельны i паслявясельны перыяды.

У давясельным перыядзе можна вылучыць такiя абрадавыя этапы, як сватанне, запоiны, змовiны (заручыны).

Сватанне – абрадавы этап, які праводзіўся з мэтай атрымаць згоду маладых на стварэнне сям‘і. Калi прыходзяць у сваты, стукаюць ў шыбы i пытаюцца, цi можна зайсцi ў хату. Пры дапамозе рытуальнага іншасказальнага дыялогу звычайна вырашаецца праблема згоды ці нязгоды на шлюб :

*«Сваты:*

*– Добры вечар! Цi не пусцiце нанач? Мы – з далѐкага краю, прытамiлiся.*

*– Добрае здароўе! Калi вы з добрымi намерамi, то заходзьце ў хату, а калi не, то iдзiце, адкуль прыйшлi.*

*– Мы людзi добрыя i з добрымi намерамi.Калi добрыя, то заходзьце ў хату.*

*Сваты праходзяць, садзяцца i пытаюцца:*

*– Мы чулi, што ў вас цялушка ѐсць, цi не прадасьце вы яе нам?*

*– Няма ў нас цялушкi. На мiнулым тыдні прадалi.*

*– Не, нам не цялушка патрэбна. У вас дачка ѐсць. Гаварылi, што*



*яна i прыгожая, i гаспадыня добрая, i да работы скорая. Як сайдземся ў цане, дык яе купiм»* [1, с. 139].

Прыведзены ўзор дыялогу памiж сватамi i бацькамi маладой

РЕПОЗИТОРИЙ ГГУ ИМЕНИ Ф. СКОРИНЫ

дэманструе ўвасоблены ў ім старажытны матыў куплі-продажу нявесты.
Заслугоўваюць асаблівай увагі адказы на пытанне, што сімвалізавала ўмову згоды або нязгоды дзяўчыны выйсці замуж: «*У знак сваѐй згоды на шлюб дзяўчына дарыць бацьку сарочку, мацеры – хустку або адрэз на сукенку і таксама ручнік. Астатніх сватоў перавязвалі ручнікамі цераз плячо*» [1, с. 139].
Паводле ўспамінаў жыхароў в. Чкалава, адразу пасля сватання адбываліся змовіны, якія суправаджаліся адпаведнымі песнямі: «*Сваты выстаўляюць на стол гарэлку, кладуць хлеб, а бацькі нявесты рыхтуюць закуску. Нявеста запрашае на змовіны гасцей. Частаванне працягваецца да досвітку. Спяваюць прыпеўкі пра сватоў жартаўлівага характару:*
*Нашы сваты – дурні,*
*Заехалі ў гумны.*
*У гумне начавалі,*
*Мышы вушы паад'ядалі.*
*У адказ на гэту прыпеўку сваты жаніха спяваюць такую:*
*У нашага свата*
*Дзіравая хата,*
*Дроў ні палена,*
*Світка па калена*» [1, с. 140].
Падчас гэтага абрадавага этапу вырашалі пытанні аб далейшым ходзе вяселля, дні яго правядзення, колькасці гасцей. Зыходзячы са сведчанняў інфармантаў, вяселле прызначаюць праз тры-чатыры тыдні пасля змовін.
Напярэдадні вяселля ў хаце бацькоў маладой адбываўся абрадавы этап «*зборная субота*», які ў мясцовай вясельнай традыцыі в. Чкалава называлі «*разборнай кашай*». Звычайна збіраліся сяброўкі нявесты, да іх прыязджаў жаніх з няжанатымі братамі, сѐстрамі, сябрамі. Як адзначалі мясцовыя жыхары, было 10-12 чалавек. Таксама абавязкова запрашалі суседак, прыходзілі і іншыя родзічы маладой: «*Напярэдадні вяселля, звычайна ў суботу, пякуць каравай. У гэты дзень нявеста запрашае сяброўак на «разборную кашу»*» [1, с. 141].
Калі прыходзілі сяброўкі да маладой, то яе маці запрашала іх за сталы. Дзяўчаты паміж сабой павінны былі дамовіцца, хто з іх будзе шыць вянок. Гэтая сяброўка маладой, якая рыхтавала вянок, звычайна павінна была падчас вяселля сядзець на куце. У мясцовай традыцыі

РЕПОЗИТОРИЙ ГГУ ИМЕНИ Ф. СКОРИНЫ

было прынята, каб малады выкупіў вянок маладой. Яго, як адзначылі інфарманты, трэба толькі «завіць» (падшыць, падагнаць)»: «*Да вянка патрэбна падшыць фату і брыжы. Падчас таго, як дзяўчаты робяць усё гэта, яны спяваюць песню:*
*Прыйшлі дзевачкі ў хатку,*
*Яны не зналі парадку.*
*Нясі, Надзечка, што рабіць,*
*Нясі рутачку вянок шыць.*
*Нясі рутачку і іголку,*
*Нясі нітачак і іголку*» [1, с. 141].
Асноўныя моманты, якія мелі месца падчас зборнай суботы, былі звязаны з падрыхтоўкай сяброўкамі вянка для маладой і кветак для маладога і шафераў: «*Дзяўчаты шуткуюць, успамінаюць цікавыя здарэнні з дзявочага жыцця, спяваюць. Калі вянок гатовы, то прымяраюць яго на замужнюю жанчыну ці старую дзеўку: «Кажуць, калі дзяўчына да замужжа прымерае вянок, то хоць і выйдзе замуж, але вянка вясельнага не прыйдзецца надзець*» [1, с.141].
У мясцовай традыцыі прадстаўлены ўнікальны абрад, звестак пра які не сустракалася ў вясельнай абраднасці іншых раёнаў Гомельшчыны – гэта разбіванне гаршка з кашай. Як вядома, гэты абрад – важны кампанент радзінна-хрэсьбіннай абраднасці: «*Потым маці маладой запрашае на частаванне. На стол накрывае розныя прысмакі. Ставіць бутэльку вішнёўкі ці медавухі. Дастае з печы гаршчок кашы і аддае першай шаферцы. Шаферка вядзе торг, прадае кашу. Заўсёды кашу стараецца выкупіць малады, потым разбівае гаршчок і дзеліць кашу на ўсіх, хто прысутнічае на вечары*» [1, с. 143].
Заслугоўваюць ўвагі сімвалічныя дзеянні з абрусам, што звязаны з прагназаваннем замужжа і выконваюцца падчас «зборнай суботы»: «*Дзяўчаты п'юць, ядуць, шуткуюць, хлопцаў не запрашаюць, яны таўкаюцца на парозе. Потым яны дагаварваюцца, як вынесці абрус і павесіць на вароты. Хуценька прамываюць міскі з першага стала, здымаюць абрус, і бойкія дзяўчаты (3-4) кідаюцца да дзвярэй. Хлопцы не пускаюць, адбіраюць абрус, валузяцца… і яны павесілі іх на вароты, гэта значыць, што ўсе дзяўчаты пойдуць замуж*» [1, с. 143].
Паводле сведчанняў інфармантаў, у в. Чкалава рыхтавалі два караваі: «*Адзін у нявесты, другі ў жаніха ў форме круга. Абрад выпечкі абодвух караваяў аднолькавы*» [1, с. 145]. Запрашалі для замешвання і выпечкі каравая толькі замужніх і шчаслівых у

РЕПОЗИТОРИЙ ГГУ ИМЕНИ Ф. СКОРИНЫ

сямейным жыцці жанчын. Лічылася, што гэта важны фактар для дабрабыту маладых: «*Для замешвання і выпечкі каравая запрашалася абавязкова замужняя жанчына, якая жыве з мужам у згодзе, якія*

*паважаюць адзін аднаго, любяць. Каб і ў маладых іх будучае жыццѐ было такое ж, як і ў каравайніцы: шчаслівае, поўнае радасці і кахання*» [1, с. 145]. Каравай абавязкова ўпрыгожвалі.

У структуры вясельнага абраду вѐскі Чкалава важнае значэнне надавалася пасаду: «*Маладую садзяць на лаву, засцеленую вывернутым кажухом. Бацька і маці благаслаўляюць крыжам, жадаюць добрага жыцця і ўсялякага шчасця. Потым бацька хросны кажа:*

*– Ацец і маці! Благаславіце сваю дачку да божага храму ехаць!*

*Бацькі адказваюць:*

*– Бог благаславіць.*

*Хросны:*

*– Другім разам, добрым часам, благаславіце!*

*– Бог благаславіць.*

*– І трэцім разам, добрым часам, благаславіце!*

*– Бог благаславіць.*

*(Такім жа чынам благаслаўлялі і жаніха ў яго бацькоў, калі ѐн ад'язджаў да нявесты)*» [1, с.146].

Надзвычай важна было сяброўкам нявесты выканаць пэўныя дзеянні падчас царкоўнага абраду вянчання, і звязаны яны былі з ручніком, на якім стаялі маладыя. Калі нявесце ўдавалася пацягнуць яго, то лічылася, што яе сяброўкі хутка выйдуць замуж: «*У час царкоўнага абраду першы шафер і шаферка рассцілаюць перад аналоем кавалак палатна або ручнік. Жаніх становіцца з правага боку, а нявеста з левага. Калі ходзяць вакол аналоя, першы шафер трымае вянец над жаніхом, а першая шаферка – над нявестаю. Нявеста ў гэты час стараецца пацягнуць за сабою падножнік, каб усе яе сяброўкі хутчэй выходзілі замуж*» [1, с. 147].

Зыходзячы з народных вераванняў, у момант вянчання трэба сачыць за тым, як гараць свечкі, што трымаюць маладыя: «*Чыя свечка хутчэй хгарыць, той першы памрэ*» [1, с. 147].

Кульмінацыя вясельнай абраднасці звязана з падзелам каравая падчас вясельнага застолля і ў хаце маладой, і ў хаце маладога. Калі ўносілі каравай, то звярталіся спачатку да бацькоў, каб атрымаць ад іх

РЕПОЗИТОРИЙ ГГУ ИМЕНИ Ф. СКОРИНЫ

блаславенне: «*Ёсць у нашай маладой бацька і маці, каб яны ласкавы былі да сюда прыбылі і маладым што-небудзь падаравалі*» [1, с. 148].
У паслявясельнай абраднасці в. Чкалава важнае значэнне надавалася сімвалічным жартоўным абрадавым дзеянням, семантыка якіх была звязана з забеспячэннем дабрабыту маладых, а таксама з ідэяй працягу роду: «*Радня маладой збіраецца да хаты маладога. Жанчыны пераапранаюцца ў мужчынскае адзенне, прычым*

*выбіраюць найбольш зношанае, абодранае. Малююць вусы сажай. Мужчыны пераапранаюцца ў спадніцы, хусткі, стараюцца паходзіць на жанчыну, што выклікае смех. Сярод іх ѐсць і «цыганка», якая прыстае к усім, просіць дазволу паваражыць. Акрамя «цыганкі», ѐсць «доктар». У яго сумцы з чырвоным крыжам знаходзіцца лякарства ад усіх хвароб – гарэлка. Ён лечыць хворых, якіх па дарозе становіцца шмат. Абавязкова ѐсць фальшывыя жаніх і нявеста*» [1, с. 151].
Такім чынам, вясельная абраднасць вѐскі Чкалава Гомельскага раѐна Гомельскай вобласці вылучаецца адметнымі мясцовымі рысамі, якія характэрны як для асобных абрадавых этапаў, так і для рытуалаў, якія былі з імі звязаны, а таксама песеннага суправаджэння, прыкмет і павер‘яў.

**Спіс літаратуры**

1 Роднае: фальклорна-этнаграфічная і літаратурная спадчына Гомельскага раѐна / аўт.-уклад. : І. Ф. Штэйнер, В. С. Новак. – Мазыр : Выдавецтва «Белы вецер», 2000. – 276 с.

РЕПОЗИТОРИЙ ГГУ ИМЕНИ Ф. СКОРИНЫ